Праграма

6-га Сусветнага кангрэса супраць смяротнага пакарання

Осла, Нарвегія, 21 – 23 чэрвеня 2016 года.

Аўторак, 21 чэрвеня

17:00-19:30 ЦЫРЫМОНІЯ АДКРЫЦЦЯ

Серада, 22 чэрвеня

9:00-11:00 ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

“Прагрэс і рэгрэс у Азіі: высновы, якія можна зрабіць”

Як нядаўнія пазітыўныя падзеі ў Азіі могуць быць выкарыстаныя для пераадолення агульных праблемаў у краінах, якія захоўваюць смяротнае пакаранне?

11:30-13:30 КРУГЛЫ СТОЛ

“Смяротнае пакаранне і праблема тэрарызму”

Як адказваць на аргументы на карысць захавання смяротнага пакарання ў выпадках тэрарызму?

СЕМІНАР

“Распрацоўка прававых стратэгій для прасоўвання адмены смяротнага пакарання”

Гэты семінар прадаставіць удзельнікам інфармацыю аб розных паспяховых прававых стратэгій і прэцэдэнтнага права, каб яны маглі распрацаваць або ўдасканаліць свае ўласныя.

15:00-17:00 КРУГЛЫ СТОЛ

“Прававыя, сацыяльныя і медыцынскія перспектывы па праблеме абароны асобаў, якія пакутуюць на псіхічныя разлады пасля вынясення смяротнага прысуду”

Якія стандарты ў галіне правоў чалавека гарантуюць абарону асобаў, якія пакутуюць на псіхічныя разлады пасля вынясення смяротнага прысуду? Якія рэальныя перашкоды існуюць на шляху іх прымянення дзеля таго, каб выключыць хворых на псіхічныя разлады з ліку асуджаных да смерці?

СЕМІНАР

“Як эфектыўна ўзаемадзейнічаць са сродкамі масавай інфармацыі? Праца са сродкамі масавай інфармацыі можа быць няпростай задачай”

Гэты семінар дазволіць абмяняцца досведам паміж журналістамі і абаліцыяністамі па праблемах камунікацыі па пытанні адмены смяротнага пакарання.

17:30-19:30 КРУГЛЫ СТОЛ

“Мігранты і меншасці: Стратэгіі па пераадоленні праблемаў у “расстрэльных” справах”

Праблемы і цяжкасці ў абароне мігрантаў і меншасцяў, якім пагражае смяротнае пакаранне. Погляд за межы дыпламатычных стратэгій.

СЕМІНАР

“Фіксаванне прымянення смяротнага пакарання”

Абмен метадалогіяй і досведам адносна таго, як пераадолець цяжкасці ў зборы і абмене інфармацыяй, а таксама назіранне за дзяржаўнай палітыкай.

Чацвер, 23 чэрвеня

9:00-11:00 ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

“Важнасць нацыянальных праваабарончых арганізацыяў у справе адмены смяротнага пакарання”

Як працаваць з нацыянальнымі праваабарончымі арганізацыямі (НПА) і згуртаваць іх вакол справы адмены смяротнага пакарання?

11:30-13:30 КРУГЛЫ СТОЛ

“Праект Пратакола аб адмене смяротнага пакарання ў Афрыцы да Хартыі правоў чалавека афрыканскіх народаў»

КРУГЛЫ СТОЛ

“ЗША: Новыя саюзнікі, якія ўступаюць у барацьбу, каб пакласці канец смяротнай кары”

Прадстаўленне новых саюзнікаў і як яны інтэгруюцца ў амерыканскія абаліцыянісцкія стратэгіі.

СЕМІНАР

“Кампаніі за адмену смяротнага пакарання, накіраваныя на парламентарыяў і выканаўчую ўладу”

Як выступаць на нацыянальным узроўні за адмену смяротнага пакарання? Метадалогія і перадавыя дасягненні ў камунікацыі з парламентарыямі і выканаўчай уладаў.

15:00-17:00 КРУГЛЫ СТОЛ

“Вырашэнне праблемы альтэрнатываў смяротнай кары”

Якія існуюць альтэрнатывы смяротнай кары? Якія захады, адпаведныя прынцыпам абароны правоў чалавека, можа прапанаваць абаліцыянісцкі рух дзеля таго, каб зрабіць альтэрнатывы больш прымальнымі для дзяржаваў, якія захоўваюць смяротнае пакаранне?

СЕМІНАР ДЛЯ ЮРЫСТАЎ

“Эфектыўная юрыдычная абарона асобаў, якім пагражае смяротнае пакаранне”

Як забяспечыць эфектыўнае юрыдычнае прадстаўніцтва? Гэты семінар адкрыты для толькі юрыстаў, каб даць ім магчымасці і прастору для абмену досведам / усталявання кантактаў.

СЕМІНАР

“Мабілізацыя моладзі ў абаліцыянісцкі рух”

Як мабілізаваць моладзь і павысіць іх дасведчанасць аб неабходнасці адмены смяротнага пакарання? Будзе прадстаўленая метадалогія і адукацыйныя матэрыялы.

17:00-17:40 МАРШ ДА МЭРЫІ (15 хвілінаў)

18:00-19:30 ЦЫРЫМОНІЯ ЗАКРЫЦЦЯ Ў БУДЫНКУ МЭРЫІ

19:30 ГЛАБАЛЬНЫ МАРШ СУПРАЦЬ СМЯРОТНАГА ПАКАРАННЯ